# МАГЧЫМАСЦІ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Казачэнка А. Е., Камінская І. К.*

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Пятрова Н. Я. – к.філал.н., дацэнт*

У рабоце вызначаюцца магчымасці інфармацыйных тэхналогій у працэсе вывучэння беларускай мовы. Разглядаецца значэнне інфармацыйных тэхналогій у жыцці чалавека наогул, звяртаецца ўвага на віды інфармацыйных тэхналогій для вывучэння розных моў. Абапіраючыся на моўную сітуацыю на Беларусі, робіцца выснова, ці сапраўды вывучэнне беларускай мовы з дапамогай інфармацыйных тэхналогій з’яўляецца эфектыўным і зручным.

Інфармацыйныя тэхналогіі сталі неад’емнай часткай сучаснага грамадства. Яны адыгрываюць вялікую ролю ва ўсіх сферах нашага жыцця: ад паўсядзённай камунікацыі да працы, ад адукацыі да забаў. Цяпер амаль усе аспекты нашага грамадства і эканомікі звязаны з выкарыстаннем камп’ютара, сеткі інтэрнэт і т. п. Гэта дазваляе нам абменьвацца інфармацыяй, перадаваць яе і ажыццяўляць камунікацыю з высокай хуткасцю і эфектыўнасцю. Дзякуючы інфармацыйным тэхналогіям, мы можам атрымліваць доступ да вялізнага аб’ёму інфармацыі з розных крыніц па ўсім свеце. Гэта дае магчымасць атрымліваць веды і пашыраць свой кругагляд, працаваць і абменьвацца вопытам на адлегласці, а таксама вывучаць розныя мовы [1].

Разгледзім прадукты інфакамунікацыйных тэхналогій для вывучэння рускай і англійскай моў.

Для рускай мовы найбольшай эфектыўнасцю валодаюць наступныя рэсурсы:

1. Бясплатныя вэб-сайты:

– "Gramota.ru" – тут можна ажыццявіць праверку напіюання слова, таксама знайсці матэрыялы па азнаямленні з правіламі рускай арфаграфіі, граматыкі і пунктуацыі і іншыя заданні для замацавання пройдзенага матэрыялу;

– "Интерактивные диктанты" – рэсурс з разнастацнымі тэестамі, у кожным з якіх ёсць пропускі. Карыстальніку трэба ўстаўляць патрэбныя адзінкі мовы, выбіраючы іх з прапанаваных варыянтаў. Па завяршэнні сістэма падлічвае колькасць дапушчаных памылак і выдае вынік.

2. Платны вэб-сайт "Orfogrammka.ru", які дазваляе ўдасканальваць валоданне рускай мовай на практыцы. Калі вам даводзіцца пісаць шмат тэкстаў, то вы можаце правяраць іх у гэтым сервіюе. Сістэма аналізуе напісанае з улікам шматлікіх нормаў мовы, указвае на памылкі і адлюстроўвае звязаныя з імі правілы.

3. Дадатак "Русский язык – грамотей", у якім больш за 16 000 тэставых заданняў па арфаграфіі, пунктуацыі і іншых галінах мовазнаўства. Сутыкнуўшыся з цяжкім тэстам, вы можаце запытаць дапамогу – праграма адлюструе звязаны з праблемай тэарэтычны раздзел.

4. Дадатак для дзяцей "Грамотей", які робіць вывучэнне і адпрацоўку ведаў па арфаграфіі для школьніка ў цікавай і даступнай форме. Яно прапануе прайсці віктарыну з варыянтамі адказаў і абраць правільнае напісанне канкрэтнага слова. Адзін тур уключае роўна 10 пытанняў. Пасля іх удзельніку ставяць адзнаку. Яна стымулюе не дапускаць памылак, бо ўсё пойдзе ў статыстыку са спісам рэкордаў.

5. Анлайн-курсы [2].

Для вывучэння англійскай мовы звернем увагу на наступныя прадукты:

1. Дадатак “LingualLeo” з вялікай колькасцю разнастайных трэніровак, якія дапамогуць пашырыць слоўнікавы запас, а таксама развіць навыкі чытання і аўдзіравання. Напрыклад, там можна вучыць лексіку па любімых трэках, фільмах і кнігах, а яшчэ спаборнічаць у «Лео-батлах» з іншымі карыстальнікамі. Усё навучанне пабудавана на гейміфікацыі, так што навучэнец не згубіць цікавасць да англійскай мовы, будзе ўвесь час адчуваць прагрэс і стымул рухацца далей.

2. Прадукт “English Galaxy” – дадатак для карыстальнікаў з любым узроўнем англійскай мовы, ад A0 да C1, які можна вызначыць перад пачаткам навучання пры дапамозе тэста. У кожным раздзеле дадатка маецца па 50 блокаў з практыкаваннямі на граматыку, лексіку і аўдзіраванне. Можна абраць зручны варыянт агучкі: брытанскі ці амерыканскі. У раздзеле «Слоўнік», напрыклад, знаходзіцца больш за 14 000 лексічных элементаў з розных катэгорый.

3. Анлайн-курсы [3].

Таксама карыснымі для вывучэння любой мовы з’яўляюцца сінтэзатары маўлення, з дапамогай якіх можна ажыццявіць гукапіс навучальных тэкстаў рознымі галасамі. Для гэтага можна карыстацца такімі прадуктамі, як Voicemaker, Apihost, Zvukogram, Robivox, Speechpad і інш. Многія з іх маюць выбар розных моў, галасоў, хуткасці чытання, даўжыні паўз і інш. Часам існуе опцыя па стварэнні пэўнага настрою, эмацыйнай афарбоўкі маўлення, да прыкладу, радасць, злосць, разгубленасць і да т.п. [4, с. 383]. Гэта спрыяе развіццю ўспрымання і разумення замежнага маўлення на слых.

Адсюль відаць, што прадукты інфармацыйных тэхналогій могуць быць самыя рознымі: анлайн-курсы, дадаткі, вэб-сайты, інтэрактыўныя гульні і інш. Яны могуць быць як платнымі, так і бясплатнымі. Усе яны з’яўляюцца эфектыўнымі ў авалоданні рознымі мовамі. Разам з тым, назіраецца недахоп падобных тэхналогій, прызначаных для вывучэння беларускай мовы. Спынімся на гэтым падрабязней.

Спачатку разгледзім спецыфіку моўнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Нягледзячы на тое, што беларуская мова для большасці краіны родная, многія карыстаецца ў паўсядзённым жыцці рускай мовай. Гістарычна склалася, што на тэоыторыі Беларусі пашырана беларуска-рускае двухмоўе, і беларускую мову ведаюць у краіне недастаткова, таму яе абавязкова трэба вывучаць. Гэта мае важнае значэнне для захавання і развіцця беларускай культуры.

Вось некалькі прыкладаў прадуктаў інфакамунікацыйных тэхналогій для вывучэння беларускай мовы:

1. Інтэрактыўныя анлайн-рэсурсы. Гэта могуць быць спецыялізаваныя вэб-сайты, навучальныя платформы, дадаткі для смартфонаў і г. д. Напрыклад: “LinGo Play”, “Prime-online”. Такія рэсурсы прапануюць шырокі спектр навучальных матэрыялаў, уключаючы ўрокі, практыкаванні, слоўнікі, аўдыа- і відэаматэрыялы. Дзякуючы інтэрактыўнасці і даступнасці гэтых рэсурсаў, можна вывучаць беларускую мову ў зручны час і ў прыдатным тэмпе.

2. Мабільныя дадаткі. Напрыклад: “LingoHut”, “Sputnik”. Такія рэсурсы валодаюць шырокай функцыянальнасцю і выгодай выкарыстання. З іх дапамогай можна ствараць персаналізаваныя навучальныя планы, вывучаць новыя словы, выразы, граматыку, а таксама трэніраваць навыкі вымаўлення і разумення на слых.

3. Відэаўрокі і анлайн-трэнінгі. Сетка Інтэрнэт прапануе мноства такіх рэсурсаў у свабодным доступе. Напрыклад: “SkillBox”, “Timeweb”. Усе яны даюць магчымасць вывучаць беларускую мову праз інфармацыю, якая распрацавана прафесіяналамі ў галіне беларускай мовы. Відэаурокі могуць суправаджацца субтытрамі, што дазваляе адначасова развіваць навыкі разумення на слых і культуру маўлення. Анлайн-трэнінгі прапануюць камунікатыўныя заданні, запаўненне прабелаў і іншыя варыянты заданняў для замацавання атрыманых ведаў.

4. Сацыяльныя медыя і форумы, напрыклад, “Semeistvo”, “Elib”. Яны даюць магчымасць практыкавацца ў рэальных сітуацыях зносін на беларускай мове і абмяркоўваць моўныя пытанні з носьбітамі мовы або іншымі людзьмі, якія яе вывучаюць. Гэта спрыяе развіццю ўпэўненасці ў вусных ці пісьмовых зносінах, паляпшэнню вуснага маўлення і разумення слэнга і інфармацыі, характэрнай для розных стыляў мовы [5; 6]

Мы лічым, што найбольш эфектыўнымі і зручнымі прадуктамі для вывучэння беларускай мовы з’яўляюцца інтэрактыўныя анлайн-рэсурсы, таму што яны змяшчаюць вялікую колькасць featнабаковых функцый для падрабязнага вывучэння нашай роднай мовы. Разам з тым, нягледзячы на мноства пераваг інфармацыйных тэхналогій навучання мовам, існуе і шэраг праблем, якія могуць паўстаць у працэсе выкарыстання падобных рэсурсаў. Асноўная праблема – гэта магчымае ўзнікненне тэхнічнага збою ў працы камп’ютара, сервера, інтэрнэта, якое можа зрабіць працэс навучання недаступным на пэўны час. Таксама выкарыстанне такіх прадуктаў з мэтай вывучэння моў патрабуе з боку навучэнцаў многіх намаганняў, у першую чаргу, высокай матывацыі, якой не заўсёды можна дасягнуць [7, с. 390].

Такім чынам, у сучасным свеце інфармацыйныя тэхналогіі даюць унікальныя магчымасці для вывучэння розных моў, у тым ліку беларускай. Магчымасці інтэрактыўных анлайн-рэсурсаў, мабільных дадаткаў, відэаўрокаў, анлайн-трэнінгаў, сацыяльных медыя і форумаў дазваляюць не толькі пашырыць слоўнікавы запас і палепшыць граматыку, але і развіць камунікатыўныя навыкі. Такі спосаб авалодання мовамі папулярны ў сучасным грамадстве, адрозніваецца высокай эфектыўнасцю, даступнасцю і зручнасцю. Разам з тым, рэсурсаў, прыдатных для вывучэння беларускай мовы, на наш погляд, недастаткова. Мы лічым, што гэты прабел трэба знімаць, паколькі пашырэнне інфармацыйных рэсурсаў для вывучэння беларускай мовы дапаможа не толькі яе распаўсюдзіць, але і ўмацаваць папулярнасць.

***Спіс выкарыстаных крыніц:***

*1. Роль информационных технологий в современном мире [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://meister-russia.ru/rol-informacionnyx-texnologii-v-sovremennom-mire. – Дата доступа: 16.10.2023.*

*2. Приложения для изучения русского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://lifehacker.ru/izuchenie-russkogo-yazyka?/yschild=lp5f0cymvi242028471. – Дата доступа: 14.10.2023.*

*3. Приложения для изучения английского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://lifehacker.ru/apps-to-learn-english?/yschild=lp5exi5bx1398393081. – Дата доступа: 10.11.2023.*

*4. Петрова, Н. Е. Использование интеллектуальных технологий в обучении русскому языку как иностранному в вузе / Н. Е. Петрова // Цифровая гуманитаристика и технологии в образовании (DHTE 2023): сб. статей IV Международной научно-практической конференции, Москва, 16 – 17 ноября 2023 г. / Под ред. В.В. Рубцова, М.Г. Сороковой, Н.П. Радчиковой. – Москва: ФГБОУ ВО МГППУ, 2023. – С. 381–389.*

*5. Форум для изучения белорусского языка [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://forum.onliner.by/viewtopic.php?t=273595&start=4200. – Дата доступа: 08.12.2023.*

*6. Информационные технологии в лингвистике [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ucheba.club/prilozhenija-dlya-izucheniya-belorusskogo-yazyka.html?ysclid=lp5h0lwlxr868994882. – Дата доступа: 26.11.2023.*

*7. Арцыменя, Д. Ф. Использование цифровых технологий для формирования языковой компетенции в процессе обучения русскому языку как иностранному в техническом вузе / Д. Ф. Арцыменя, Н. Е. Петрова // Русский язык в глобальном научном и образовательном пространстве: Сборник материалов Международного научного конгресса. В 3-х частях, Москва, 06 – 10 декабря 2021 г. / М. Н. Русецкая (гл. ред.), М. А. Осадчий (отв. ред.). – Москва: Государственный институт русского языка им. А. С. Пушкина, 2021. – С. 389 – 393.*